# Петрашкевіч Алесь
# 1930-2012



Алесь Петрашкевіч (Аляксандр Лявонцьевіч) — беларускі пісьменнік, драматург.

Нарадзіўся ў вёсцы Пярэвалачня Талачынскага раёна. Кандыдат гістарычных навук, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за ўдзел у падрыхтоўцы і выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Аўтар апавяданняў, фельетонаў, нарысаў. Працаваў у розных жанрах драматургіі. Пісаў сцэнарыі мастацкіх і дакументальных фільмаў.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны скончыў 3 класы пачатковай школы. У 1948 годзе скончыў Забалоцкую сямігадовую, у 1951 годзе — Коханаўскую сярэднюю школу. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1955г.). У 1975–76гг. — рэктар Мінскага інстытута культуры. У 1967–75гг., 1979–91гг. — адказны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя”. Кіраваў арганізацыйна-метадычным цэнтрам па выданні гісторыка-дакументальных хронік “Памяць”. У 1961 годзе стаў членам Саюза журналістаў Беларусі, у 1974 годзе — членам Саюза пісьменнікаў БССР. Член Беларускага саюза тэатральных дзеячаў з 1970 года.

Дэбютаваў у 1954 годзе. Пісаў сцэнарыі мастацкіх, дакументальных (“Уздоўж і ўпоперак Дняпра” (1990г.), “Гетман найвышэйшы” (1992г.) і навукова-папулярных фільмаў (“Францыск, сын Скарынін”). Значнае месца ў творчасці драматурга займала гістарычная тэматыка.

Першая камедыя “Адкуль грэх” была пастаўлена ў 1969 годзе Беларускім тэатрам імя Я. Купалы. Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача паставіў у 1985 годзе яго драму “У спадчыну — жыццё”, якую аўтар прысвяціў сваім землякам. Гэтая п’еса была  пастаўлена і Талачынскім народным тэатрам (рэжысёр С. Васільева).

Аўтар лібрэта да оперы “Новая зямля” паводле аднайменнага рамана Якуба Коласа (пастаўлена Дзяржаўным тэатрам оперы і балета БССР у 1982 годзе). Шырокую карціну жыцця сваіх аднавяскоўцаў як добры яго знаўца, з псіхалагічным заглыбленнем, пісьменнік прадаставіў чытачу ў кнізе “Крыніцы і каламуць”, якая выйшла у 2008 годзе.

П’еса “Напісанае застаецца” (пастаноўка 1979г.) — у многім твор палемічны. Апрача Францыска Скарыны — цэнтральнага персанажа п’есы — А. Петрашкевіч уводзіць у твор у якасці дзейных асоб Міколу Гусоўскага, Пятра Мсціслаўца, Томаса Мюнцэра, Марціна Лютэра, Максіма Грэка, Мікалая Каперніка. Драма “Прарок для Айчыны” (тэлефільм, 1991г.) прысвечана віленскаму перыяду жыцця першадрукара.

Спробы спалучыць камедыйнасць і праблемнасць былі зроблены ім у п’есе “Куды ноч, туды сон” (іншая назва — “Ка-та-стро-фа”, 1987г., пастаноўка 1988г.). Камедыю ён назваў фантасмагорыяй. Гэтай тэме была прысвечана і драма А. Петрашкевіча “Трывога” (1974г.).

# Дадатковыя матэрыялы
# аб жыцці і дзейнасці:


1. **Алесь Петрашкевич** // В атмосфере художественного поиска и стилевого многообразия: творчество витебских литераторов во второй половине 1960-х — начале 1990-х годов : монография : в 2 ч. / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. — Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2012. — Ч. 1. — С. 190–220.
2. **Алесю Петрашкевічу — 80** // Наша слова. — 2010. — № 17 (28 красавіка.). — С. 1.
3. **Аляксандр Лявонцьевіч Петрашкевіч** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. : І.П. Шамякін [і інш.] ; мастак А.М. Хількевіч. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. — С. 645–646.
4. **Бірукоў, В.** Шчырая і жыццёва глыбінная споведзь / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2010. — 6 лютага. — С. 10.
5. **Драматург, прозаик, историк, издатель** // Моя Толочинщина: страницы истории / Анатолий Шнейдер. — 2-е изд, с изм. — Минск : Бизнесофсет, 2006. — С. 133–135.
6. **Карніловіч, Э.** Сябра Петруся Броўкі / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013. — 4 верасня. — С. 7.
7. **Маляўка, П.І.** Петрашкевіч Алесь / Пётр Маляўка // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : [у 6 т.] / рэдкал. : І.Э. Багдановіч [і інш.]. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 5 : Пестрак–Сяўрук. — С. 13–14.
8. **Петрашкевич Алесь** (Александр Леонтьевич) // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол. : Т.В. Белова и др. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. — Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. — Кн. 2. — С. 294.
9. **Петрашкевич Алесь** (Александр Леонтьевич) // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол. : Г.П. Пашков [и др.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 6 : Пейзаж–Снегирёв. — С. 41.
10. **Петрашкевіч Алесь** (Аляксандр Лявонцьевіч) // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал. : У.У. Андрыевіч [і інш.]. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. — Т. 6 : М–Я. — С. 166.
11. **Саламевіч, І.У.** Петрашкевіч Алесь (Аляксандр Лявонцьевіч) / І.У. Саламевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2001. — Т. 12 : Палікрат–Праметэй. — С. 334.
12. **Салтук, А.** Напісанае застаецца / Алесь Салтук // Віцебскі рабочы. — 2005. — 30 красавіка. — С. 4.
13. **Шнейдер, А.** Драматург, прозаик, историк / Анатолий Шнейдер // Наша Талачыншчына. — 2005. — 6 мая. — С. 6.

## Кнігі:

1. **Ад бога да людзей** / Алесь Петрашкевіч. — Мінск : Беларусь, 1967. — 36 с.
2. **Адкуль грэх?** / Алесь Петрашкевіч. — Мінск : Беларусь, 1970. — 87 с. : іл.
3. **Воля на крыжы** : Гістарычныя п’есы / Алесь Петрашкевіч ; афарм. М.Р. Казлова. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. — 269 с. : іл.
4. **Здрапежаная зямля** : Гістарычныя п’есы / Алесь Петрашкевіч ; пад рэд. А.П. Грыцкевіча. — Мінск : УП “Тэхнапрынт”, 2003. — 444 с. : іл.
5. **П’есы** / Алесь Петрашкевіч ; маст. Н.Л. Шаўшукова. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. — 205 с. : іл.
6. **“Приласкать и уничтожить!”** : гістарычная трагедыя / Алесь Петрашкевіч. — Мінск : Медисонт, 2008. — 85 с. : іл.

## Інтэрнэт-рэсурсы:

1. **Алесь Петрашкевіч** : [Электронны рэсур]. — Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Алесь_Петрашкевіч. — Дата доступу : 01.11.2022.
2. **Алесь Петрашкевич** — о драматурге : [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://www.livelib.ru/author/403546-ales-petrashkevich. — Дата доступа : 01.11.2022.
3. **Беларуская палічка.** Алесь Петрашкевіч : [Электронны рэсур]. — Рэжым доступу : https://knihi.com/Ales_Pietraskievic/. — Дата доступу : 01.11.2022.
4. **Петрашкевич,** Александр Леонович : [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://agro-archive.ru/stati/17206-petrashkevich-aleksandr-leonovich.html. — Дата доступа : 01.11.2022.
5. **Петрашкевіч Алесь** : [Электронны рэсур]. — Рэжым доступу : http://pridvinie.vlib.by/index.php/mtree-lib/pismenniki-paety-litaratary/petrashkevich-ales. — Дата доступу : 01.11.2022.